# НОВАЯ ТРАДЫЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ-ПАЧАТКОЎЦАЎ

Ні для кога не сакрэт, што фае філалагічнага факультэта, дзе так любяць збірацца не толькі студэнты-філолагі, але і хлопцы ды дзяўчаты іншых факультэтаў, даўноператварылася ў своеасаблівую сцэну. На перапынках тут часта гучыць музыка, ладзяцца разнастайныя конкурсы і акцыі. А нядаўна, на пачатку мая, упершыню прайшоў Тыдзень журналісцкай творчасці, які быў прымеркаваны да Дня друку.

У межах тыдня быў праведзены шэраг творчых імпрэз: тэатральныя пастаноўкі «Шлях да радакцыйнага поспеху», «Два газетчыкі», «У пагоні за хайпам», конкурс на лепшую газетную публікацыю, сустрэчы з загадчыкам аддзела інтэрнэт-праектаў абласной газеты «Витебские вести» Наталляй Рыжковай і журналісткай, пісьменніцай, мастачкай Анастасіяй Лазебнай.

«Ідэя правядзення Тыдня журналісцкай творчасці належыць супрацоўнікам дэканата ФлФ і выкладчыкам кафедры літаратуры. Нам было надзвычай цікава яго праводзіць, паколькі ў нас гэта першы такі вопыт. Мяркуем, што мерапрыемства можа стаць традыцыйным, але ўсё залежыць выключна ад жадання саміх студэнтаў», – зазначыла дацэнт кафедры літаратуры Ганна Віктараўна Навасельцава.

Пад яе кіраўніцтвам першакурснікі спецыяльнасці «Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)» падрыхтавалі насценную газету. У ёй будучыя журналісты распавялі пра гісторыю свята друку, правялі бліцапытанне, папрасіўшы студэнтаў выказаць сваё меркаванне наконт такой цікавай і адначасова складанай дзейнасці, як журналістыка.

Хлопцам і дзяўчатам другога і трэцяга курсаў было дадзена аднолькавае заданне: напісаць сцэнарый, сабраць аматарскую акцёрскую трупу і рэалізаваць свае творчыя задумкі. Лепшыя ідэі былі прадстаўлены на суд гледачоў.

Так, у аснову тэатральнай пастаноўкі другакурснікаў было пакладзена апавяданне вядомага рускага празаіка і драматурга Антона Паўлавіча Чэхава «Два газетчыкі». Чаму менавіта чэхаўскі твор? На думку Г.В. Навасельцавай, творчасць гэтага пісьменніка з'яўляецца тым яскравым прыкладам, калі творца напачатку працаваў як журналіст, а затым – як празаік і драматург. Журналістыка дазволіла Антону Паўлавічу ўвасобіць свае дасягненні і стала крыніцай натхнення для мастацтва слова.

Трэцякурснікі праявілі крэатыўнасць, прэзентаваўшы індывідуальныя творчыя праекты. Безумоўна, кожнай тэатральнай групе ўдалося пасвойму прадэманстраваць сваё акцёрскае майстэрства. Мне ж выпала магчымасць пабыць у якасці рэжысёра...

У апошні дзень Тыдня журналісцкай творчасці былі падведзены вынікі конкурсу на лепшую газетную публікацыю. Яго пераможцамі сталі таленавітыя студэнткі трэцяга курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)» Анастасія Бучкіна, Крысціна Дайлідзёнак і Юлія Рудзякова.



Хочацца спадзявацца, што Тыдзень журналісцкай творчасці стане на філалагічным факультэце добрай традыцыяй. А мы, будучыя журналісты, будзем гэтаму садзейнічаць.

**Алеся ДАЎЖЭНКА, студэнтка 2-га курса ФлФ.**

**Фота аўтара.**